■ Меркаванне

# ВЫБАРШЧЫКАМ ПАТРЭБНЫ «ЛІКБЕЗ»

**Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» сёння, мабыць, самая дасведчаная арганізацыя ў пытаннях удзелу ў выбарчых кампаніях. На яе рахунку парламенцкія выбары 2008/2012 гадоў, выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў 2010-га і 2014 гадоў, выбары Прэзідэнта ў 2010-м і 2015 гадах. Не стаў выключэннем удзел членаў грамадскага аб'яднання ў сёлетніх выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Намеснік старшыні «Белай Русі» Аляксандр ШАЦЬКО расказаў карэспандэнту «Звязды» падрабязней пра асаблівасці цяперашняй выбарчай кампаніі.**

***— У чым, на ваш погляд, заключаецца галоўнае адрозненне гэтай выбарчай кампаніі ад папярэдніх парламенцкіх выбараў?***

— Асноўная адметная рыса — гэта слабая актыўнасць выбаршчыкаў на дадзеным этапе выбараў. Відаць, гэта звязана з тымі працэсамі, якія адбываюцца ў грамадстве, эканоміцы. Варта таксама не забываць што зараз яшчэ сезон летніх адпачынкаў. Усе гэтыя моманты негатыўна ўплываюць на актыўнасць людзей.

Трэба таксама адзначыць, што некаторым нашым грамадзянам усё яшчэ патрэбны юрыдычны «лікбез», які дазволіў бы лепш зразумець дзейнасць Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Парламент — гэта найвышэйшая ступень дэпутацтва ў краіне. Мэты і задачы парламента — не прыбіраць двары і ўпарадкоўваць дарогі, з гэтым мусяць спраўляцца прадстаўнікі мясцовых выканкамаў. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў павінны займацца заканатворчасцю на больш высокім узроўні. Яны таксама валодаюць прадстаўнічымі функцыямі, вызначаюць месца краіны на міжнароднай арэне. Грамадзяне павінны разумець тое, куды яны абіраюць сваіх дэпутатаў і з якой мэтай. Мы стараемся гэта данесці да людзей праз свае мерапрыемствы.

Мы назіраем за развіццём сітуацыі. Можна адзначыць, што ў перыяд дадзенай выбарчай кампаніі некаторыя выбаршчыкі лічаць, што ў парламенце робіцца не так шмат з таго, што яны б хацелі. У буйных гарадах гэта менш прыкметна, чым у невялікіх. Крызіс адбіўся на ўсіх, і колькасць фінансаў, якія выдзяляюцца на сацыяльныя праекты і многае іншае, скарацілася. У некаторых сферах зменшыўся аб'ём дзяржпадтрымкі. Цэны на прадукты харчавання і шэраг паслуг не стаяць на месцы. Усе гэтыя фактары таксама ўскладняюць працу ў працэсе выбарчай кампаніі.

***— У сувязі з пасіўнасцю выбаршчыкаў як вы плануеце прыцягваць увагу да кандыдатаў, якіх падтрымліваеце?***

— Нас сёння 164 тысячы чалавек, і ў нас ёсць вопыт палітычнай работы. Гэтыя выбары для нас ужо не першыя, і мы ўлічваем негатыўны вопыт перадвыбарчых кампаній папярэдніх гадоў. Мы шмат займаліся маніторынгам, навучаннем нашых актывістаў. І назіральнікі, і тыя, хто будуць агітаваць на пікетах, атрымліваюць вялікую колькасць інфармацыі пра сітуацыю ў краіне, юрыдычныя асновы. Нашы актывы падрыхтаваны і могуць данесці да выбаршчыка ўсю неабходную інфармацыю.

***— На якую ўзроставую групу выбаршчыкаў вы арыентуецеся ў працэсе агітацыі?***

— Мы свае сілы накіроўваем на выбаршчыкаў ад 30 гадоў. Але добра працуем і з моладдзю. У нас ёсць нямала арганізацый сярод студэнтаў. Ёсць і аналітычныя групы, якія складаюцца з маладых людзей. Мы лічым, што моладзь трэба навучаць, рабіць з яе кадравы патэнцыял. З ёй мы працуем на працягу ўсяго года. Нават праводзім сумесныя мерапрыемствы з ветэранамі.

***— Ці часцей грамадзяне сталі звяртацца ў прыёмныя «Белай Русі» ў працэсе выбарчай кампаніі?***

— Нашы прыёмныя працуюць заўсёды. Аднак у працэсе выбарчай кампаніі яны наведваюцца больш актыўна. Людзі пачынаюць часцей сюды прыходзіць, прычым у большасці сваёй для таго, каб параіцца ці пачуць меркаванне па якім-небудзь пытанні. Кожны раз да нас прыходзіць каля дзясятка чалавек, каб атрымаць неабходную інфармацыю. Прычым прыязджаюць людзі з усёй Беларусі — не з саміх абласных цэнтраў, дзе таксама ёсць прыёмныя, а з невялікіх гарадоў. Мы ім максімальна дапамагаем, тым самым стараемся падтрымліваць імідж нашага грамадскага аб'яднання ў плане вырашэння праблем.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*




■ Даследаванні

## Сучасная моладзь цікавіцца палітыкай

**Большасць моладзі лічыць, што галасаваць на выбарах — гэта іх грамадзянскі абавязак. Да такой высновы прыйшлі спецыялісты сацыялагічнай службы БРСМ. Даследаванне праводзілася да 12 жніўня і паказала, што сучасная моладзь цікавіцца палітыкай.**

— Гэта сведчыць пра тое, што маладыя грамадзяне Беларусі бачаць свой голас як адзін з патрэбных краіне, — каментуе лічбы **каардынатар работы ў інтэрнэт-прасторы і па сацыяльных даследаваннях БРСМ Алеся ВІННІК.** — Мы таксама праводзілі даследаванні па палітычных партыях, якіх у нашай краіне 15 афіцыйна зарэгістраваных. Яны не вельмі актыўныя, таму нельга асацыяваць моладзь з той ці іншай палітычнай суполкай. Зацікаўленасць маладых людзей кожнай з іх даволі малая. Аднак некаторыя партыі застаюцца на слыху: большасць апытаных дакладна ведаюць пра Камуністычную партыю Беларусі і пра Ліберальна-дэмакратычную. Але літаральна толькі 2-3 чалавекі ўспомнілі іншыя палітычныя аб'яднанні. Пры гэтым 94,1% апытаных сказалі, што не з'яўляюцца членам ні адной партыі... Яшчэ падобнае сацыялагічнае даследаванне па грамадскіх аб'яднаннях з прыцягненнем больш шырокага ўзроставага дыяпазону паказала: практычна ўсе апытаныя ўваходзілі ў тую ці іншую грамадскую арганізацыю. Гэта сведчыць пра тое, што дзейнасць арганізацый больш адпавядае мэтам людзей. Ва ўваходзе ў палітычныя партыі альбо не бачаць сэнсу, альбо не падзяляюць іх мэтаў і задач.

Вынікі даследаванняў у выглядзе інфаграфікі з'яўляюцца ў афіцыйных групах БРСМ у сацыяльных сетках. Кожны тыдзень праводзіцца інтэрнэт-апытанні. У Саюза моладзі каля 500 суполак ва «УКантакце», каля 100 блогаў у «Твітары» і столькі ж у «Фэйсбуку». Зараз развіваецца іх прысутнасць у «Інстаграме» і новых сацыяльных сетках.

— Важна данесці правільную інфармацыю пра выбары да моладзі, якая падпісана на гэтыя групы, праглядае стужку, пастаянна перапісваецца, — працягвае Алеся Віннік. — Для нас задача, у першую чаргу, стаіць у тым, каб юнакі і дзяўчаты прыйшлі на выбары. Мы праводзім шэраг інтэрнэт-акцый. Найперш гэта інфармаванне праз сацыяльныя сеткі з хэштэгам #выборы2016 #Беларусь. Яшчэ мы праводзім акцыі, якія дазваляюць расказаць пра сацыяльна-эканамічныя дасягненні Беларусі за перыяд працы парламента гэтага склікання. Праект мы сімвалічна назвалі «Яскравая Беларусь». Кожны ахвотны можа з выкарыстаннем хэштэга выкласці фатаграфію, дзе ён насупраць знакавага аб'екта або прадпрыемства ў сваім горадзе, якім ён сапраўды ганарыцца. Размясціць здымак можна з подпісам, альбо цяпер маладыя людзі цікава фатаграфуюцца з плакатамі: надпіс ці малюнак можна зрабіць на аркушы А4, каб не тлумачыць інфармацыю ў каментарыі.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Паралелі

# ХУТЧЭЙ, ВЫШЭЙ, МАЦНЕЙ



**Як вядома, са старажытных часоў усталявалася адно з галоўных спартыўных правілаў: калі пачынаюцца Алімпійскія гульні, то мусяць прыпыніцца ўсе войны. Праз гэтае правіла алімпійскі рух даваў чалавецтву надзею на мір, магчымасць пераасэнсаваць канфлікты паміж народамі, пазбегнуць новых ахвяр.**

На жаль, у нашы дні гэта правіла выглядае як нейкі атавізм ці казка з далёкіх часоў. Нікога ўжо і не здзіўляе, што падчас чарговай Алімпіяды ў свеце няспынна працягваюцца крывавыя войны, нават узрастаюць іх маштаб і інтэнсіўнасць. Сёння вядучыя інфармацыйныя агенцтвы свету падаюць адно за другім то апошнія навіны са спартыўных пляцовак Рыа-дэ-Жанэйра, то жудасныя паведамленні з гарачых кропак планеты.

Да бясконцых кадраў разбуранняў і чалавечай пакуты з Блізкага Усходу, дзе сёння ўсе ваююць супраць усіх, мы ўжо нават і прызвычаіліся. Хаця, здавалася б, ці да такога ўвогуле можна прызвычаіцца? Але ж адначасова ўсё больш трывожныя навіны прыходзяць з Данбаса. Там мы якраз ужо было пачалі прызвычайвацца (ці проста так нам вельмі хацелася думаць) да хай сабе хісткага, але ж перамір'я. Пасля Мінскіх пагадненняў, падпісаных у беларускай сталіцы ў лютым 2015 года, дыпламаты і эксперты прыкладалі велізарныя намаганні, каб перавесці канфлікт у стабільна замарожаны стан і пасля ўжо рухацца ў бок яго ўрэгулявання і, дай Бог, вырашэння.

А тут пачынаецца Алімпіяда — і мы зноў назіраем аднаўленне баёў і ўзаемныя пагрозы бакоў, Кіева і ДНР з ЛНР, перафісі да паўнамаштабных баявых дзеянняў. Да таго ж, у больш шырокім кантэксце ўкраінска-расійскага канфлікту пачынаецца новае абвастрэнне праз апошнія падзеі ў Крыме: Масква абвінавачала Міністэрства абароны Украіны ў падрыхтоўцы тэрарыстычных акцый на паўвостраве і заявіла пра чалавечыя страты падчас спецаперацыі супраць дыверсантаў. Што і як адбылося насамрэч, пакуль незразумела, але замалёўка для алімпійскага сезона яшчэ больш непрыемная.

У такіх міжнародных трэндаў ужо, на жаль, не першы год ёсць свой сімвал: падзеі Абхазіі і Паўднёвай Асеціі 2008 года. Тады, як і зараз, толькі распачаліся Алімпійскія гульні і гледачы з усяго свету атрымалі асалоду ад прыгожай цырымоніі іх адкрыцця і параду міру ў Пекіне з удзелам лепшых спартсменаў, — на Каўказе выбухнула. Актыўныя баявыя дзеянні тады цягнуліся толькі пяць дзён, але ж паказальны і сімвалічны сам факт.

Вайна, на жаль, зноў становіцца штодзённай часткай сучасных міжнародных адносінаў, хаця некалі здавалася, што пасля жудасных трагедый мінулага стагоддзя гэтая з'ява будзе пакрысе сыходзіць на перыферыю чалавечых стасункаў, стане абсалютным выключэннем з усіх правіл. Тым больш на еўрапейскім кантыненце.

Невядома, ці дойдзе чалавецтва калі-небудзь да такога ўзроўню развіцця, калі гуманістычныя каштоўнасці зробяць войны і асобныя ўзброеныя канфлікты немагчымымі. Але, на жаль, дакладна зразумела, што сёння трэнд развіцця ідзе хутчэй у адваротным кірунку. І можна доўга абурацца з гэтай нагоды, абвінавачваць вялікія дзяржавы, ААН ці яшчэ каго, але, на жаль, міжнародная рэчаіснасць ад гэтага не зменіцца.

Бадай, самае важнае, што ў гэтай складанай і вельмі небяспечнай сусветнай рэчаіснасці застаецца рабіць невялікім краінам, у тым ліку і Беларусі, — гэта быць рэалістамі.

Як бы банальна гэта ні гучала, але ж у выніку заўсёды выйграюць тыя краіны, чый нацыянальны інтэлект аказваецца вышэйшы, чым у знешнепалітычных партнёраў і канкурэнтаў. А для маленькай краіны інтэлект, прафесіяналізм і прагматызм — гэта ўвогуле адзіныя рэсурсы, на якія можна абаперціся ў часы глабальных выклікаў. Ды і ў штодзённым жыцці для невялікай і беднай на прыродны выкапні краіны гэта адзіны фактар уласнай бяспекі і канкурэнтаздольнасці.

Іншымі словамі, трэба жыць згодна з добра вядомым алімпійскім дэвізам: «Citius, Altius, Fortius!» («Хутчэй, вышэй, мацней!»). Можна нават сказаць, што алімпійцам у сённяшніх умовах мусіць стаць амаль кожны — на сваім працоўным і грамадскім месцы. Менеджар прадпрыемства, які кожную секунду павінен думаць пра тое, як зрабіць сваю прадукцыю самай канкурэнтаздольнай, а не пра тое, як выцягнуць з дзяржаўнага бюджэту паболей субсідый. Чыноўнік, які мусіць пастаянна ствараць найлепшыя і сучасныя ўмовы для працы нашых бізнесменаў, стартапаў і даўно існуючых прадпрыемстваў, прыцягнення ўнутраных і знешніх інвестыцый. Інтэлектуал і аналітык, якія ў сваёй працы і парадах ураду ці грамадству абавязаны трымацца далёка ад рознага кшталту канспіралогій і зашоранасці. Патрэбны вынік.

**Як бы банальна гэта ні гучала, але ж у выніку заўсёды выйграюць тыя краіны, чый нацыянальны інтэлект аказваецца вышэйшы, чым у знешнепалітычных партнёраў і канкурэнтаў.**

Асаблівае месца тут мусіць належыць і парламенту, які павінен быць цэнтрам інтэлектуальнай і экспертнай дыскусіі ў краіне. Сёлетняя кампанія па выбарах яго будучых дэпутатаў якраз у самым разгары. Але пакуль, на жаль, асабліва не бачна напружанай барацьбы ідэй і праграм кандыдатаў, а таксама палітычных партый, якія шмат хто з іх прадстаўляе. Зноў больш увагі амаль з усіх бакоў надаецца працэдурным спрэчкам, а не канкурэнцыі мадэляў развіцця краіны і яе рэгіёнаў.

Будзем спадзявацца, што характар парламенцкай кампаніі зменіцца цяпер пасля афіцыйнага пачатку стадыі агітацыі. І што кандыдаты на дэпутацкія крэслы, як і спартсмены, будуць займацца ў гэтыя няпростыя часы не фармалізмам ці папулізмам, а арыентавацца на галоўны прафесійны стандарт — хутчэй, вышэй, мацней!

**Яўген ПРЭЙГЕРМАН**